Весці БДПУ. Серыя 2. 2024. № 2. С. 13–20

*УДК 94(476)“1861/1914”*

# ДВАРАНСТВА Ў САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ СТРУКТУРЫ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА (1861–1914 гг.)

**А. П. Жытко,**
*доктар гістарычных навук,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі
і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага
педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-4750-1772;*

**С. А. Талмачова,**
*доктар гістарычных навук, загадчык кафедры
гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага
ўніверсітэта імя Максіма Танка
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6708-0282*

Паступіў у рэдакцыю 30.05.2024.

*UDC 94(476)“1861/1914”*

# NOBILITY IN THE SOCIO-ECONOMIC STRUCTURE OF BELARUSIAN SOCIETY (1861–1914)

**A. Zhitko,**
*Doctor of History, Professor of the
Department of History of Belarus and Slavic
Nations, Belarusian State Pedagogical
University named after Maxim Tank
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-4750-1772;*

**S. Tolmacheva,**
*Doctor in History, Head of the Department
of History of Belarus and Slavic
Nations, Belarusian State Pedagogical
University named after Maxim Tank
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6708-0282*

Received on 30.05.2024.

У артыкуле паказана дваранства ў сацыяльна-эканамічнай структуры беларускага грамадства ў 1861–1914 гг. Праведзены аналіз колькаснага, веравызнальнага і нацыянальнага складу, адукацыйнага ўзроўню вышэйшага саслоўя ў параўнанні з іншымі сацыяльнымі групамі і ўсім насельніцтвам. Раскрыта роля дваранства ў капіталізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і індустрыяльным развіцці Беларусі. Зроблена выснова, што набілітэт края толькі па сваім паходжанні з'яўляўся рудыментам феадальнай эпохі, а ў парэформенны перыяд па сваім змесце пераўтварыўся ў прадпрымальнікаў буржуазнага тыпу.

*Ключавыя словы:* дваранства, Беларусь, колькасць, веравызнанне, нацыянальнасць, адукацыйны ўзровень, сельская гаспадарка, прамысловасць, саслоўе, прадпрымальніцтва, рынкавыя адносіны.

The article shows the nobility in the socio-economic structure of Belarusian society in 1861-1914. Analyzed the quantitative, religious and ethnic composition, educational level of higher class in comparison with other social groups and the entire population. The role of the nobility in the capitalization of agricultural production and industrial development. The conclusion is that the citizens of the province only in its origin was a relic of the feudal era, and after the reform has become a bourgeoisie.

*Keywords:* nobility, Belarus, quantity, religion, nationality, education, agriculture, industry, estate, entrepreneurship, market relations.

*Уводзіны.* Да 1917 г. Расійская імперыя ў сацыяльна-юрыдычным плане захавала ўсе саслоўныя інстытуты, якія склаліся яшчэ ў феадальную эпоху. Падзел грамадства на саслоўі замацоўваў за кожным з іх пэўныя прывілеі і абавязкі. Асноўнымі саслоўямі ў імперыі былі дваране, праваслаўнае духавенства, гарадскія і сельскія абывацелі. Самым прывілеяваным з іх з'яўлялася дваранства.

Прынцып партыйна-класавага падыходу не дазволіў савецкім гісторыкам аб'ектыўна асвяціць ролю і месца вышэйшага саслоўя ў развіцці краіны. А між тым у Расійскай імперыі на працягу стагоддзяў прагрэс грамадства ў значнай ступені быў звязаны з дзейнасцю дваранства. У навуковым даследаванні нельга пераносіць сучаснасць на мінулае, мадэрнізаваць гісторыю. Гэта было значным недахопам савецкай гістарыяграфіі, якая давала адназначна адмоўную ацэнку дваранству толькі таму, што яно было прывілеяваным саслоўем, параджэннем феадальнай эпохі. Пры гэтым не надавалася ўвагі таму, што без наяўнасці такога саслоўя ў тагачасных расійскіх умовах грамадскі і культурны прагрэс быў бы амаль што немагчымы.

Саслоўная ўстойлівасць расійскага дваранства вызначалася не толькі падтрымкай яго з боку ўрада, але ў большай меры тым, што яно ніколі не было замкнутай кастай. Папаўненне дваранскага саслоўя на падставе спадчыннасці спалучалася з уваходжаннем у яго склад прадстаўнікоў іншых саслоўяў, якія дабіваліся пэўнага чыну на вайсковай ці

грамадзянскай службе ці мелі значныя заслугі перад дзяржавай. У гэтых умовах саслоўе папаўнялася не толькі колькасна, але і якасна.

Пасля далучэння Беларусі да Расіі вышэйшае саслоўе краю было ўключана ў склад набілітэту імперыі. Разам з тым, яно атрымала значна меншыя правы, чым карысталася ў складзе Рэчы Паспалітай. Яго адносіны з царскім урадам насілі супярэчлівы характар. На працягу ўсяго імперскага перыяду дваранства Беларусі ў сваёй большасці не толькі заставалася ў апазіцыі да царызму, але і неаднаразова ўступала з ім у адкрытую ўзброеную барацьбу (паўстанні 1794 г., 1830–1831 гг., 1863–1864 гг.). А гэта прамое сведчанне таго, што дваранства не проста служыла самадзяржаўнай уладзе, але і клапацілася аб больш шырокіх дзяржаўных і народных інтарэсах. Таму абвінавачванні дваранства ў кансерватыўнасці (у прымяненні да перыяду капіталізму), асабліва вышэйшага саслоўя Беларусі, не апраўдана.

Асобныя аспекты гаспадарчай дзейнасці памеснага дваранства знайшлі сваё ўвасабленне ў працах такіх беларускіх гісторыкаў, як Л. П. Ліпінскі [1], В. П. Панюціч [2], Х. Ю. Бейлькін [3], М. Ф. Болбас [4], В. А. Кахновіч [5] і інш. Разам з тым, патрабуецца высветліць ролю і месца вышэйшага саслоўя Беларусі ва ўсёй сістэме сацыяльна-эканамічных аднсін у краі на этапе станаўлення і развіцця буржуазнага грамадства.

*Асноўная частка.* Вышэйшае саслоўе Расійскай імперыі юрыдычна было неаднародным. Яно падзялялася на дзве асноўныя страты – спадчыннае і асабовае. У сваю чаргу спадчыннае дваранства складалася з 6 разрадаў у залежнасці ад спосабаў яго атрымання. У параўнанні з унутранымі губернямі імперыі ў Беларусі значная доля прыпадала на сапраўдных дваран (1-шы разрад) і старажытныя шляхетныя роды – 6-ты разрад. Да першага разраду адносіліся тыя, што даказалі сваю прыналежнасць да вышэйшага саслоўя. Вялікая ўдзельная вага сярод спадчыннага дваранства старажытных родаў тлумачыцца тым, што інстытут дваранства ў Вялікім Княстве Літоўскім склаўся значна раней, чым у Расіі.

Асабовае дваранства з'яўлялася адной з важнейшых крыніц папаўнення спадчыннага дваранства. Асабовыя дваране карысталіся значна меншымі прывілеямі ў параўнанні са спадчыннымі. Яны толькі фармальна ўваходзілі ў склад карпаратыўнай арганізацыі, не запісваліся ў дваранскія радаводныя кнігі, дваранства не перадавалася іх дзецям у спадчыну і г. д. У асноўным гэта былі чыноўнікі ці афіцэры ніжніх чыноў.

У адрозненне ад рускіх губерняў, у Беларусі было неістотным папаўненне спадчыннага дваранства за кошт асабовых з ліку мясцовых жыхароў. Гэта тлумачыцца тым, што для прадстаўнікоў рымска-каталіцкага веравызнання з 1864 г. практычна забаранялася грамадзянская і ваенная служба ў краі.

У Беларусі існавала і трэцяе падраздзяленне дваранства – былая «польская» шляхта. Звычайна гэта былі дробназямельныя ці абеззямеленыя асобы вышэйшага саслоўя Рэчы Паспалітай, якія дакументальна не змаглі даказаць сваё высокае паходжанне. Юрыдычна гэта катэгорыя прыпыніла сваё існаванне з 1865 г., але фактычна шляхта як асобы сацыяльны феномен не была ліквідавана.

На дынаміку колькаснага складу вышэйшага саслоўя Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. паўплывалі ўнутрыпалітычныя падзеі як у Паўночна-Заходнім краі, так і ў імперыі наогул. Буржуазныя рэформы ў Расіі праводзіліся «зверху» і ў пэўнай ступені з улікам інтарэсаў дваранства. Але бессаслоўны характар рэформ значна звузіў кола прывілеяў дваранства. Яно вымушана было прыстасоўвацца да новых умоў жыцця. У сувязі з гэтым значная частка вышэйшага саслоўя цэнтральных губерняў Расіі свае надзеі на будучыню па-ранейшаму звязвала з царскім урадам. Што тычыцца дваранства Беларусі, то яно ў сваёй большасці, асабліва рымска-каталіцкага веравызнання, успрыняло рэформы другой паловы XIX ст. і Першую расійскую рэвалюцыю як магчымасць адраджэння былой Рэчы Паспалітай. Гэта з'явілася асновай яго духоўнай стойкасці і прывязанасці да сваіх маёнткаў.

Паражэнне паўстання 1863–1864 гг. істотна паўплывала на колькасць спадчынных дваран у 5 беларускіх (Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская) губернях. З 1863 па 1867 г. яна паменшылася амаль напалову. Гэта было выклікана не столькі рэпрэсіямі ў дачыненні да ўдзельнікаў паўстання і яму спачуваўшых, колькі перавод з 1 студзеня 1865 г. шляхты, што дакументальна не даказала сваё высакароднае паходжанне, у саслоўе сельскіх ці гарадскіх абывацелей. Але ў наступным назіралася колькаснае павелічэнне вышэйшага саслоўя. Ужо ў 1897 г. гэты паказчык склаў 205 тыс. чал. супраць 121 тыс. чал. у 1867 г. Разам з тым, яго доля ў складзе ўсяго насельніцтва краю паступова скарачалася. Адной з прычын гэтага была палітыка царызму па «разборы шляхты» і шырокамаштабныя рэпрэсіі ў дачыненні да дваранства рымска-каталіцкага веравызнання. Але, нягледзячы на гэтыя акцыі, працэнт спадчынных дваран у краі

адносна ўсяго насельніцтва заставаўся высокім. Так, напрыканцы XIX ст. ён раўняўся 2,4 %, а ў Еўрапейскай Расіі – толькі 0,9 %. Аб здольнасці спадчыннага дваранства Беларусі прыстасавацца да новых умоў жыцця сведчыць факт павелічэння ў яго асяроддзі колькасці гарадскіх жыхароў. У 1858 г. яны складалі каля 10 %, а ў 1913 г. – ад 20 % у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, да 33 % у Гродзенскай губерні [6, с. 45, 49–51].

Павелічэнне колькасці асабовых дваран у Беларусі ў азначаны перыяд мела тую адметную асаблівасць, што гэта адбывалася ў асноўным за кошт выхадцаў з рускіх губерняў, а тэмпы прыросту саступалі агульнарасійскім паказчыкам больш чым у 2 разы. Да таго ж, пераважная большасць асабовых дваран і класных чыноўнікаў пражывала ў гарадах.

Аналіз дынамікі колькаснага складу вышэйшага саслоўя Беларусі перыяду капіталізму не дазваляе выявіць асноўныя яе заканамернасці. Гэта тлумачыцца тым, што натуральны працэс унутрысаслоўнага руху пастаянна парушаўся дзеяннямі царскіх урадавых колаў у краі.

Дваранства Беларусі, побач са святарамі, было самым адукаваным саслоўем. На падставе аналізу даных Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва 1897 г. намі ўстаноўлена, што ўзровень пісьменнасці сярод дваран-мужчын і чыноўнікаў, якія пражывалі ў сельскай мясцовасці, склаў 70,1 %, а жанчын – 54,2 %. У гарадах гэтыя суадносіны склалі 94,3 % і 87,5 % адпаведна [7].

Больш яскрава ўзровень адукацыі дваран і класных чыноўнікаў праяўляецца ў параўнанні з усім насельніцтвам. Так, на долю гэтай катэгорыі прыходзіўся 81,0 % мужчын і 64,9 % жанчын, якія вучыліся ва ўніверсітэтах, адпаведна 83,5 % і 90,0 % сярод закончыўшых іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Акрамя гэтага, дваране аддавалі перавагу вышэйшым і сярэднім ваенным навучальным установам. Прадстаўніцтва ў іх іншых саслоўяў было нязначным. На долю дваран прыходзілася 96,5 % асобаў, якія атрымалі вышэйшую ваенную адукацыю, і 94,3 % – сярэднюю ваенную адукацыю. Найменшай пашанай у дваран карысталіся сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Адукацыю ў іх атрымалі 27,4 % мужчын і 22,2 % жанчын. Такія ўстановы давалі спецыяльныя веды ў галіне камерцыйнай, прамысловай і сельскагаспадарчай дзейнасці, у якіх былі зацікаўлены непрывілеяваныя саслоўі. У сярэдніх навучальных установах дваране складалі каля паловы навучэнцаў. Сярод жанчын пераважалі дваранкі (56,1 %) [7]. Гэта з'яўлялася важнай перадумовай здзяйснення вышэйшым саслоўем вызначальнай ролі ў фарміраванні грамадскай думкі, развіцці культуры, вызначэнні нацыянальнага абрысу краю. Адносна высокая адукаванасць дваранства з'явілася вынікам прамой падтрымкі з боку царскага ўрада, за якой стаялі перш за ўсё яго палітычныя інтарэсы. Аднак вышэйшае саслоўе Беларусі каталіцкага веравызнання ў другой палове XIX ст. гэтай падтрымкі было пазбаўлена. Таму агульны паказчык адукацыйнага ўзроўню дваранства Беларусі на рубяжы XIX–XX стст. аказаўся ніжэйшым, чым у цэлым па Еўрапейскай Расіі. Гэта адмоўна паўплывала і на складванне нацыянальнай інтэлігенцыі, якая здольна падняцца вышэй сваіх класавых інтарэсаў.

Дваранства Беларусі азначанага перыяду было неаднародным па канфесійнай прыналежнасці. Яно падзялялася на дзве асноўныя часткі – праваслаўную і каталіцкую. Устанавіць колькасць усіх спадчынных дваран па веравызнанні даволі складана ў сувязі з адсутнасцю статыстыкі ў пачатку 60-х гг. XIX ст. Гэта можна зрабіць толькі ў дачыненні да дваран-землеўласнікаў. Так, у 1862 г. у пяці беларускіх губернях пражывала 9 929 памесных дваран, а разам з сем'ямі – 50–60 тыс. чал., ці 25–30 % ад усяго саслоўя. З іх 93,3 % з'яўляліся католікамі, а 6,7 % – праваслаўнымі і лютэранамі [8, арк. 96–97].

Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. расійскі ўрад паставіў перад сабой мэту эканамічна падарваць «паляка», ураўнаць рускае і «польскае» землеўладанне ў краі. Законам ад 10 снежня 1865 г. католікам забаранялася купляць землі ў заходніх губернях [9, с. 44–50]. Рускім жа пакупнікам прадастаўляліся ўсе магчымыя льготы. Усё гэта прывяло да павелічэння колькасці рускіх дваран-землеўласнікаў у Беларусі. У 1904 г. колькасць памесных дваран праваслаўнага веравызнання склала 4 365 чал. (20,6 %), ва ўладанні якіх было 2 920 тыс. дзес. зямлі. Католікаў-землеўласнікаў налічвалася 11 405 чал. (70,1 %), а зямлі ў іх – 4 447 тыс. дзес. [10, арк. 65].

Царскі ўрад выкарыстаў веравызнальную прыкмету для таго, каб перанесці яго і на нацыянальную прыналежнасць. Беларускае дваранства, незалежна ад яго пазіцыі, штучна падзялілі на рускіх і палякаў. Геапалітычнае становішча Беларусі з'яўлялася разменнай картай у міжнароднай палітыцы еўрапейскіх дзяржаў і Расіі. Таму беларускае дваранства каталіцкага веравызнання ў сваёй большасці рабіла стаўку на аднаўленне Польшчы ў межах 1772 г., а праваслаўнае – прапагандавала ідэю «заходнерусізму». У сувязі з гэтым у асяроддзі беларускага дваранства толькі ў пачатку XX ст. пачала фарміравацца краёвая ідэя – барацьба

за аднаўленне Вялікага Княства Літоўскага ці наданне Беларусі аўтаноміі ў складзе Расійскай рэспублікі.

У той жа час штучная ідэнтыфікацыя ўрадам канфесійнай і нацыянальнай прыналежнасці дваранства па прынцыпе: католік – значыць паляк, праваслаўны – рускі стала прычынай скажэння колькасці дваран-беларусаў. Між тым у сельскай мясцовасці спадчынныя дваране-беларусы складалі большасць – 60,3 %. Сярод гарадскога вышэйшага саслоўя на долю беларусаў у канцы XIX ст. прыпадала толькі 13 % [11]. Гэта азначае, што гарады, дзе праходзілі асноўныя працэсы фарміравання нацыі, у Беларусі аказаліся амаль што без нацыянальнага набілітэту.

Вышэйшае саслоўе ў перыяд капіталізму адыгрывала значную ролю ў эканоміцы Беларусі. Асноўным сродкам сельскагаспадарчай вытворчасці ў парэформенныя гады з'яўлялася зямля. У выніку скасавання прыгону яна фармальна станавілася аб'ектам свабоднай куплі-продажу.

У ходзе эвалюцыі дваранскага землеўладання ў Беларусі асноўныя працэсы, якія тут адбываліся ў азначаны час, па сваім характары адпавядалі агульнарасійскім. У прыватнасці, у Беларусі, як і наогул у Расіі, назіралася скарачэнне дваранскага і павелічэнне бессаслоўнага прыватнага землеўладання. Па даных пазямельных перапісаў, удзельная вага дваранскага землеўладання ва ўсёй прыватнай зямельнай уласнасці Беларусі паменшылася з 91,0 % у 1877 г. да 71,8 % у 1905 г. [12]. Зямля ўсё больш станавілася аб'ектам куплі-продажу. Падала ўлада зямлі, павялічвалася ўлада грошай. Аднак у Беларусі гэты працэс у значнай ступені быў дэфарміраваны пад уздзеяннем палітыкі самадзяржаўя ў краі. Увядзенне абмежавальных законаў адносна набыцця зямлі дваранамі рымска-каталіцкага веравызнання і яўрэямі штучна стрымлівала працэс яе мабілізацыі. Гэта значыць, што праблема землеўладання ў Паўночна-Заходнім краі з эканамічнай пераўтварылася ў палітычную. Галоўнай мэтай царызму з'яўлялася ўмацаванне тут сваіх пазіцый праз насаджэнне рускага землеўладання.

Урадавая пазямельная палітыка ў краі прывяла да таго, што аб'ектыўнае скарачэнне дваранскага землеўладання ў Беларусі адбывалася ў значна меншых памерах, чым у рускіх губернях. Калі ў цэлым па Еўрапейскай Расіі з 1877 па 1905 г. дваране страцілі 27,2 % зямлі, у Беларусі – толькі 10,8 %. Відавочна, гэта было і адлюстраваннем таго, што памешчыкі краю больш паспяхова прыстасаваліся да новых капіталістычных адносін.

Зямельныя мабілізацыйныя працэсы ў Беларусі стрымліваліся таксама наяўнасцю вялікай колькасці маяратаў, сервітутаў, цераспалосіцы, неакрэсленых пазямельных адносін памешчыкаў з сялянамі і іншымі катэгорыямі земляробаў. Пераадоленне гэтых феадальных перажыткаў зацягнулася ў Беларусі на неапраўдана доўгі тэрмін, што стрымлівала развіццё капіталізму як у памешчыцкай, так і сялянскай гаспадарках.

Стварэнне Дваранскага пазямельнага банка (1885 г.) і дзейнасць яго аддзяленняў у Беларусі не ўнесла істотных змяненняў у працэс пераразмеркавання дваранскага землеўладання, таму што банк абслугоўваў толькі дваран рускага паходжання. Разам з тым, дзейнасць банка надала зямельным мабілізацыйным працэсам больш цывілізаваны, уласцівы буржуазнаму грамадству характар.

У парэформенны перыяд традыцыйнай галіной сельскагаспадарчай вытворчасці заставалася земляробства. У першыя два дзесяцігоддзі пасля скасавання прыгону дваранска-памешчыцкае земляробства ў Беларусі апынулася ў стане глыбокага крызісу. Гэта было выклікана як агульнымі наступствамі рэформы 1861 г., так і рэпрэсіўнай палітыкай царызму пасля паўстання 1863–1864 гг. у дачыненні да дваран рымска-каталіцкага веравызнання. Асабліва адмоўна на стан памешчыцкай гаспадаркі паўплываў 10 % збор з прыбыткаў маёнткаў дваран-католікаў, які канчаткова быў скасаваны ў 1897 г. Аднак з цягам часу, нягледзячы на адмоўнае ўздзеянне аграрнага крызісу 80–90-х гг. XIX ст., памешчыцкая гаспадарка паступова прыстасоўвалася да капіталістычных адносін. Праяўленыя большасцю дваран схільнасць і здольнасць да пераўтварэнняў у земляробстве на пачатках капіталізму сведчаць аб тым, што прычынамі захавання перажыткаў феадалізму ў парэформенны перыяд была не сама па сабе наяўнасць дваран-памешчыкаў, а перш за ўсё існаваўшая ў той час самадзяржаўная сістэма ўлады.

Дваране Беларусі ў цэлым паспяхова адказалі на выклік часу. Для іх уласцівай была ўспрымальнасць да навін у агратэхніцы і агракультуры. Хаця ў савецкай гістарыяграфіі было прынята лічыць, што дваране вымушаны былі пераходзіць да прымянення сельскагаспадарчых машын і новай тэхнікі з-за звужэння магчымасцей выкарыстання імі сялянскай працы, на самай жа справе ўсё было не так адназначна. Не будзе перабольшваннем, калі скажам, што значная частка дваран, асабліва латыфундысты, у сваёй земляробчай дзейнасці арыентаваліся перш за ўсё на перадавы вопыт заходніх краін. Мэта – падняць прыбытковасць

сваіх гаспадарак, а не проста эканамічна выжыцць.

Пералом у распаўсюджванні машын адбыўся пад уплывам аграрнага крызісу, а таксама далейшай пралетарызацыі сялянства. У сярэдзіне 90-х гг., па даных Міністэрства дзяржаўных маёмасцей і земляробства, Беларусь па распаўсюджванні палепшаных прылад працы знаходзілася на 2-м месцы пасля Наварасіі. У памешчыкаў яны складалі 54–86 % [1, с. 74]. У 1910 г. у Беларусі на кожны маёнтак прыпадала ў сярэднім 5 жалезных плугоў і 5,5 іншых палепшаных прылад працы і машын. У прыватных уладальнікаў на 1 000 дзес. пасеву прыходзілася 54,6 жалезных плугоў, 86 жалезных і з жалезнымі зубамі баронаў, 10,8 малацілак, 21,4 розных машын, з якіх веялкі складалі 12,5 [13, с. 135].

Механізацыя сельскай гаспадаркі спрыяла пад'ёму прадукцыйнасці працы, пашырэнню вытворчасці. Машына аказвалася рэнтабельнай толькі пры вялікай колькасці зямлі. Таму машыны выкарыстоўваліся ў асноўным у буйназямельных памешчыкаў. Прымяненне машын садзейнічала паглыбленню ўнутранага рынку для капіталізму, стымулявала развіццё прамысловасці, павялічвала патрэбы на кваліфікаваных сельскагаспадарчых рабочых. Машынная праца выцясняла адработкі, якія з'яўляліся тормазам на шляху капіталістычнага прагрэсу. Прымяненне палепшаных прылад працы і машын было цесна звязана і з укараненнем шматпольных севазваротаў.

Важнай галіной дваранска-памешчыцкай сельскагаспадарчай вытворчасці з'яўлялася жывёлагадоўля. Вынікі даследавання паказваюць, што жывёлагадоўля ў другой палове XIX – пачатку XX ст. наўпрост была звязана з капіталістычнымі пераўтварэннямі ў сельскай гаспадарцы. Памешчыкі Беларусі паступова пераходзілі ад экстэнсіўнай да інтэнсіўнай жывёлагадоўлі. Яны не проста павялічвалі колькасць жывёлы ў сваіх гаспадарках, але і актыўна займаліся развядзеннем яе палепшаных парод.

У прыватнасці, у конегадоўлі памесныя дваране заснавалі значную колькасць конных заводаў, праз якія забяспечвалі патрэбы краю ў пародзістых, пераважна замежных, конях. Гэта дало магчымасць удасканаліць мясцовыя пароды коней. Іх выкарыстоўвалі ў якасці цяглавай сілы для новых сельскагаспадарчых машын і механізмаў.

Значны ўклад памешчыцкія гаспадаркі Беларусі ўнеслі і ў павелічэнне колькасці і паляпшэнне якасных характарыстык буйной рагатай жывёлы. З 1856 па 1911 г. яе колькасць павялічылася больш як удвая. З канца XIX ст. у некаторых памешчыцкіх гаспадарках назіралася актыўная селекцыйная работа па паляпшэнні беларуска-літоўскай пароды кароў праз скрыжаванне з лепшымі замежнымі пародамі. У выніку павялічыліся як вага жывёлы, так і выхад малака і мяса [14, с. 11, 13, 35, 69, 71; 15, с. 235–236].

Сведчаннем прыстасавання памешчыцкай буйнарагатай жывёлагадоўлі да рыначнай эканомікі з'явілася набыццё ёю гандлёва-прадпрымальніцкага характару. У эканоміях ствараліся адкормачныя пункты, чаму ў значнай ступені садзейнічала і наяўнасць значнай колькасці бровараў. З 80-х гг. XIX ст. у памешчыцкіх гаспадарках даволі высокімі тэмпамі пачала развівацца і малочна-таварная жывёлагадоўля. З 1856 па 1911 г. статак буйной рагатай жывёлы ў 5 беларускіх губернях павялічыўся з 1567,7 тыс. да 3217,8 тыс. галоў. Беларусь на пачатку XX ст. пераўтварылася ў край малочнай жывёлагадоўлі. Аб гэтым яскрава сведчаць статыстычныя даныя. Так, калі ў 1856 г. у Еўрапейскай Расіі на 100 жыхароў прыходзілася 12,6 дойных кароў, а ў 5 беларускіх губернях – 12,3, то ў 1911 г. гэтыя суадносіны раўняліся 9,6 і 14,5 адпаведна [14, с. 153]. Па нашых падліках, у пачатку XX ст. вытворчасць масла і сыру ў Беларусі склала 250–300 тыс. пудоў [14, с. 161–162]. Гэта патрабавала забеспячэння малочнатаварнай жывёлагадоўлі высокім навуковым і практычным вопытам. Таму актыўна праводзілася селекцыйная работа, ствараліся міжгаспадарчыя кантрольныя саюзы. У сваю чаргу, сельскагаспадарчыя таварыствы, членамі якіх у асноўным былі памешчыкі, арганізавалі школы і курсы па падрыхтоўцы спецыялістаў малочнай вытворчасці. Для перапрацоўкі малочнай прадукцыі засноўваліся масларобчыя і сыраварныя заводы.

Арыентацыя на мяса-малочную вытворчасць спрыяла павышэнню таварнасці сельскай гаспадаркі, пашырэнню яе інтэнсіфікацыі і спецыялізацыі, далейшаму развіццю ўнутранага і знешняга гандлю.

Усё гэта сведчанне таго, што дваранска-памешчыцкая сельскагаспадарчая вытворчасць у Беларусі, і перш за ўсё яе жывёлагадоўчая галіна, даволі паспяхова пераводзілася на рыначныя рэйкі. У сваю чаргу, частка памешчыкаў, якая не здолела гэта ажыццявіць, выбывала з сферы сельскагаспадарчай вытворчасці і страчвала зямельную ўласнасць. Гэта абвяргае ленінскую канцэпцыю аб рэакцыйнасці памешчыцкай гаспадаркі як носьбіта перажытачных форм гаспадарання ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і неабходнасці яе ліквідацыі для забеспячэння прагрэсу сельскагаспадарчай

вытворчасці. Якраз наадварот, менавіта на базе передавых дваранска-памешчыцкіх гаспадарак у савецкія часы засноўваліся першыя камуны і кааператывы. Таму разбурэнне памешчыцкіх эканомій з’явілася крокам не наперад, а назад.

Адным з важных кірункаў гаспадарчай дзейнасці дваран (у першую чаргу землеўласнікаў) было прамысловае прадпрымальніцтва, гандаль лесам і лесаматэрыяламі. Гэта сфера дзейнасці ў парэформенны перыяд з’явілася адлюстраваннем агульнага працэсу пераўтварэння ўсёй дваранскай гаспадаркі на рыначных пачатках. Пасля скасавання прыгону прамысловасць працягвала называцца дваранскай толькі па форме. Што тычыцца яе вытворча-эканамічнага зместу, то яна амаль ва ўсім адпавядала рыначным патрабаванням. Гэта азначае, што ад феадальнага мінулага ў арганізацыі і функцыяванні дваранскай прамысловасці наогул нічога не засталося, а сама яна пераўтварылася ў капіталістычную. І гэта неабвержнае сведчанне таго, што дваранства ў парэформенны перыяд не з’яўлялася натуральным праціўнікам новага, буржуазнага ладу.

Развіццю памешчыцка-дваранскай прамысловасці садзейнічала і шпаркае будаўніцтва чыгунак, шашэйных дарог, павелічэнне попыту на лесаматэрыялы, прадукты хімічнай прамысловасці, якая працавала на мясцовай сыравіне, на спірт і інш. Па няпоўных і супярэчлівых даных колькасць дваранска-памешчыцкіх цэнзавых прадпрыемстваў пастаянна павялічвалася. Так, у 60-х гг. XIX ст. у 35 беларускіх паветах дзейнічалі 94 дваранскія мануфактуры і фабрыкі, 83 % ад іх агульнай колькасці. У 1901 г., па нашых падліках, толькі фабрык і заводаў у руках дваран было 454, што складала прыкладна 53 % ад іх агульнай колькасці, а ў 1913 г. – 615, альбо 48,0 % [падлічана па: 4, с. 118–119; 13, с. 53; 16, с. 41–47, 53, 81, 83, 133–135, 149–150, 183–184, 190, 205–207, 259, 279–280, 342–344, 350, 368–369, 410, 480–490].

Такім чынам, з 60-х гг. XIX ст. да 1913 г. колькасць дваранска-памешчыцкіх прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці павялічылася ў 6,5 разы, але доля іх сярод іншых саслоўяў паменшылася ў 1,7 разы. Гэта азначае, што чыста буржуазная прамысловасць развівалася значна больш хуткімі тэмпамі, чым прамысловасць абуржуазіўшыхся памешчыкаў.

У парэформенныя гады ўдзельная вага дваран сярод уладальнікаў фабрык і заводаў паступова скарачалася. Так, у 1860–1869 гг. суадносіны ўласнікаў-дваран і ўласнікаў-купцоў ва ўсёй буйной прамысловасці раўняліся 5,2 да 1,0, а ў асобных галінах, як, напрыклад, харчасмакавай – 13,8 да 1,0, дрэваперапрацоўчай – 2,5 да 1,0, тэкстыльнай – 0,3 да 1,0. У гарбарна-абутковай, металаапрацоўчай, сілікатна-будаўнічай і хімічнай галінах амаль усе мануфактуры і фабрыкі належалі дваранам. У 90-х гг. XIX ст. на 343 буйныя дваранскія прадпрыемствы прыходзілася ўжо 293 купецкіх, 89 мяшчанскіх і 16 дзяржаўных і акцыянерных таварыстваў [4, с. 116].

Разам з тым, ва ўмовах захавання латыфундыяльнага дваранскага землеўладання парушаўся прынцып роўнасці ўмоў буржуазнай канкурэнцыі ў прамысловай дзейнасці. Калі для новай буржуазіі сыравіна для прамысловасці з’яўлялася таварам, дык дваране ў шматлікіх выпадках з’яўляліся яе ўласнікамі. У сувязі з гэтым існуе палажэнне, што абмежаванасць вольнай канкурэнцыі і няроўнасць умоў доступу да крыніц сыравіны тармазілі развіццё буржуазнай прамысловасці. Гэта так толькі таму, што большасць памешчыцкіх прадпрыемстваў у першыя дзесяцігоддзі пасля скасавання прыгону працавалі на мясцовай сыравіне. Але паступова ствараліся прадпрыемствы, якія выкарыстоўвалі і экспартную сыравіну. Гэта шоўкапрадзільная, бавоўняная, хрустальная, машынабудаўнічая і іншыя галіны.

Аналіз прамыслова-прадпрымальніцкай дзейнасці дваранства Беларусі паказвае, што колькасць дваранскіх мануфактур, фабрык і заводаў у другой палове XIX – пачатку XX ст. нераўнамерна, але няўхільна павялічвалася. Прамысловы пераварот закрануў практычна ўсе галіны дваранскай прамысловасці. Машынная тэхніка і новыя тэхналогіі спрыялі пашырэнню выпуску прадукцыі, фарміраваўся новы клас буржуазнага грамадства – фабрычна-заводскі пралетарыят. Сам жа дваранін-прамысловец станавіўся прамысловым буржуа.

*Заключэнне.* На тэрыторыі края была сканцэнтравана трэцяя частка ўсяго вышэйшага саслоўя Еўрапейскай Расіі, што ў сярэдзіне XIX ст. складала амаль 5 % ад усяго насельніцтва Беларусі, а ў канцы стагоддзя – 2,4 % У сваёй пераважнай большасці яно пражывала ў сельскай мясцовасці, хаця заканамерна павялічвалася праслойка дваран-гараджан. Набілітэт Беларусі быў самым адукаваным пасля святароў саслоўем. Сярод тых, хто закончыў універсітэты і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, дваране абсалютна лідзіравалі, што абумовіла іх уплыў на фарміраванне нацыянальнай інтэлігенцыі, развіццё культуры і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Разам з тым, вышэйшае саслоўе было неаднародным па канфесійнай прыналежнасці.

У асноўным яно падзялялася на каталікаў і праваслаўных. Гэтым былі абумоўлены палітычныя, эканамічныя і культурныя наступствы. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай каталіцкае дваранства знаходзілася ў адкрытай ці латэнтнай апазіцыі да самадзяржаўнай улады, якая ў сваю чаргу з 60-х гг. XIX ст. імкнулася эканамічна падарваць гаспадарку прадстаўнікоў рымска-каталіцкага веравызнання. Па сваім паходжанні спадчыннае дваранства было мясцовым і ў сваёй большасці атаясамляла сябе з беларусамі.

Вышэйшае саслоўе адыгрывала вядучую ролю ў эканамічным развіцці краю. У прыватным землеўладанні яно лідзіравала, нягледзячы на страту часткі сваіх зямельных уладанняў. Зямля з'яўлялася не толькі асновай сельскагаспадарчай, але і прамысловай вытворчасці. Менавіта маёнткавае, у асноўным буйназямельнае, дваранства было носьбітам перадавых агратэхнічных тэхналогій, паскарала прагрэс у сельскагаспадарчай вытворчасці. Вышэйшае саслоўе адыграла важную ролю ў індустрыялізацыі краю. Да пачатку XX ст. яно лідзіравала сярод іншых саслоўяў па колькасці фабрык і заводаў і аб'ёму выпуску прамысловай прадукцыі. Такім чынам, дваранства ў парэформенную эпоху толькі па сваім паходжанні заставалася феадальным саслоўем, а па змесце ператварылася ў прадпрымальнікаў буржуазнага тыпу.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Липинский, Л. П.* Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (вторая половина XIX в.) / Л. П. Липинский. – Минск : Наука и техника, 1971. – 254 с.
2. *Панютич, В. П.* Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. / В. П. Панютич ; науч. ред. П. Г. Козловский. – Минск : Навука і тэхніка, 1990. – 373, [2] с.
3. *Бейлькин, Х. Ю.* Сельскохозяйственный рынок Белоруссии, 1861–1914 гг. / Х. Ю. Бейлькин ; науч. ред. М. О. Бич. – Минск : Наука и техника, 1989. – 286 с.
4. *Болбас, М. Ф.* Промышленность Белоруссии, 1860–1900 гг. / М. Ф. Болбас. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 312 с.
5. *Кохнович, В.* Хозяйство в имениях на Полесье в 1861–1914 гг. / В. Кохнович. – Saarbrücken : Lambert Academic Publishing, 2015. – 358 с.; Кохнович, В. Передовые помещичьи хозяйства Беларуси в свете «Кратких справочных сведений» начала XX в. / В. Кохнович // Веснік БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2013. – № 3. – С. 11–18.
6. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. : манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.
7. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. / под ред. [и с предисл.] Н. А. Тройницкого. – [СПб.] : изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1899–1905. – IV : Виленская губерния. Тетр. 3. – 1904. – С. 28, 34, 40; V : Витебская губерния. – Тетр. 3. – 1903. – С. 28, 32, 40, 48, 56; XI. Гродненская губерния. – 1904. – С. 58, 63, 80, 87; XXII : Минская губерния. – 1904. – С. 52, 58, 64, 70; XXIII : Могилевская губерния. – 1903. – С. 52, 60, 68, 76, 84.
8. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 1282. Воп. 1. Спр. 365.
9. Сборник правительственных распоряжений по водворению русских землевладельцев в Северо-Западном крае. – Вильна : тип. Штаба Вилен. воен. окр., 1870. – [2], XX, 346 с.
10. РДГА. – Ф. 1276. Воп. 1. Спр. 106.
11. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. / под ред. [и с предисл.] Н. А. Тройницкого. – [СПб.] : изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1899–1905. – IV : Виленская губерния. Тетр. 3. – 1904. – С. 164–168; V : Витебская губерния. – Тетр. 3. – 1903. – С. 256–268; XI : Гродненская губерния. – 1904. – С. 290, 292, 298, 300, 302, 304; XXII : Минская губерния. – 1904. – С. 244; XXIII : Могилевская губерния. – 1903. – С. 250.


*References*


1. *Lipinskij, L. P.* Razvitie kapitalizma v sel'skom hozyajstve Belorussii (vtoraya polovina HIH v.) / L. P. Lipinskij. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1971. – 254 s.
2. *Panyutich, V. P.* Social'no-ekonomicheskoe razvitie belorusskoj derevni v 1861–1900 gg. / V. P. Panyutich ; nauch. red. P. G. Kozlovskij. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1990. – 373, [2] s.
3. *Bejl'kin, H. Yu.* Sel'skohozyajstvennyj rynok Belorussii, 1861–1914 gg. / H. Yu. Bejl'kin ; nauch. red. M. O. Bich. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1989. – 286 s.
4. *Bolbas, M. F.* Promyshlennost' Belorussii, 1860–1900 gg. / M. F. Bolbas. – Minsk : Izd-vo BGU, 1978. – 312 s.
5. *Kohnovich, V.* Hozyajstvo v imeniyah na Poles'e v 1861–1914 gg. / V. Kohnovich. – Saarbrücken : Lambert Academic Publishing, 2015. – 358 s.; Kohnovich, V. Peredovye pomeshchich'i hozyajstva Belarusi v svete «Kratkih spravochnyh svedenij» nachala XX v. / V. Kohnovich // Vesnik BDU. Ser. 3, Gistoryya. Ekanomika. Prava. – 2013. – № 3. – S. 11–18.
6. *Zhytko, A. P.* Dvaranstva Belarusi peryyadu kapitalizmu. 1861–1914 gg. : managrafiya / A. P. Zhytko. – Minsk : BDPU, 2003. – 233 s.
7. Pervaya Vseobshchaya perepis' naseleniya Rossijskoj imperii 1897 g. / pod red. [i s predisl.] N. A. Trojnickogo. – [SPb.] : izd. Centr. stat. kom. M-va vnutr. del, 1899–1905. – IV : Vilenskaya guberniya. Tetr. 3. – 1904. – S. 28, 34, 40; V : Vitebskaya guberniya. – Tetr. 3. – 1903. – S. 28, 32, 40, 48, 56; XI. Grodnenskaya guberniya. – 1904. – S. 58, 63, 80, 87; HHII : Minskaya guberniya. – 1904. – S. 52, 58, 64, 70; HHIII : Mogilevskaya guberniya. – 1903. – S. 52, 60, 68, 76, 84.
8. Rasijski dzyarzhaўny gistarychny arhiў (RDGA). – F. 1282. Vop. 1. Spr. 365.
9. Sbornik pravitel'stvennyh rasporyazhenij po vodvoreniyu russkih zemlevladel'cev v Severo-Zapadnom krae. – Vil'na : tip. Shtaba Vilen. voen. okr., 1870. – [2], XX, 346 s.
10. RDGA. – F. 1276. Vop. 1. Spr. 106.
11. Pervaya Vseobshchaya perepis' naseleniya Rossijskoj imperii 1897 g. / pod red. [i s predisl.] N. A. Trojnickogo. – [SPb.] : izd. Centr. stat. kom. M-va vnutr. del, 1899–1905. – IV : Vilenskaya guberniya. Tetr. 3. – 1904. – S. 164–168; V : Vitebskaya guberniya. – Tetr. 3. – 1903. – S. 256–268; XI : Grodnenskaya guberniya. – 1904. – S. 290, 292, 298, 300, 302, 304; HHII : Minskaya guberniya. – 1904. – S. 244; HHIII : Mogilevskaya guberniya. – 1903. – S. 250.

12. Статистика поземельной собственности и населенных мест Европейской России : По данным обследования, произвед. стат. учреждениями, М-ва внутр. дел по поруч. Стат. совета. – СПб. : Центр. стат. ком., 1880–1885. – Вып. 5 : Губернии литовской и белорусской групп. – 1882. – С. 6, 46, 50, 82, 112; Статистика землевладения 1905 г. / Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел. – СПб., 1906–1907. – Вып. 11 : Гродненская губерния. – 1906. – С. 10; Вып. 13 : Могилевская губерния. – 1906. – С. 1; Вып. 19 : Минская губерния. – 1906. – С. 10; Вып. 27 : Витебская губерния. – 1907. – С. 105; Вып. 34 : Виленская губерния. – 1906. – С. 10.
13. Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900–1917 / [под ред. Г Т. Ковалевского и др.] ; Акад. наук БССР. Ин-т экономики. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1963. – 422 с.
14. Статистические таблицы Российской империи, составленные и изданные по распоряжению министра внутренних дел Статистическим отделом Центрального статистического комитета : За 1856 год. – СПб., 1858. – XX, 300 с.
15. Сборник статистико-экономических сведений по сельскому хозяйству России и иностранных государств / М-во земледелия. Отд. сел. экономии и с.-х. статистики. – 1907–1917. – Год шестой. – СПб., 1913. – XIV, 601 с.
16. Список фабрик и заводов Европейской России. – СПб. : [Журн.] «Вестник финансов», 1903. – 838 с.

12. Statistika pozemel'noj sobstvennosti i naselennyh mest Evropejskoj Rossii : Po dannym obsledovaniya, proizved. stat. uchrezhdeniyami, M-va vnutr. del po poruch. Stat. soveta. – SPb. : Centr. stat. kom., 1880–1885. – Vyp. 5 : Gubernii litovskoj i belorusskoj grupp. – 1882. – S. 6, 46, 50, 82, 112; Statistika zemlevladeniya 1905 g. / Centr. stat. kom. M-va vnutr. del. – SPb., 1906–1907. – Vyp. 11 : Grodnenskaya guberniya. – 1906. – S. 10; Vyp. 13 : Mogilevskaya guberniya. – 1906. – S. 1; Vyp. 19 : Minskaya guberniya. – 1906. – S. 10; Vyp. 27 : Vitebskaya guberniya. – 1907. – S. 105; Vyp. 34 : Vilenskaya guberniya. – 1906. – S. 10.
13. Ekonomika Belorussii v epohu imperializma. 1900–1917 / [pod red. G T. Kovalevskogo i dr.] ; Akad. nauk BSSR. In-t ekonomiki. – Minsk : Izd-vo Akad. nauk BSSR, 1963. – 422 s.
14. Statisticheskie tablicy Rossijskoj imperii, sostavlennye i izdannye po rasporyazheniyu ministra vnutrennih del Statisticheskim otdelom Central'nogo statisticheskogo komiteta : Za 1856 god. – SPb., 1858. – HH, 300 s.
15. Sbornik statistiko-ekonomicheskih svedenij po sel'skomu hozyajstvu Rossii i inostrannyh gosudarstv / M-vo zemledeliya. Otd. sel. ekonomii i s.-h. statistiki. – 1907–1917. – God shestoj. – SPb., 1913. – XIV, 601 s.
16. Spisok fabrik i zavodov Evropejskoj Rossii. – SPb. : [Zhurn.] «Vestnik finansov», 1903. – 838 s.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ